Спорт-тайм

# БЕЛАРУСЫ ДАПУШЧАНЫ ДА ПАРАЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ 2024 ГОДА

## У традыцыйным аглядзе «Звязды» — самыя важныя спартыўныя падзеі

**НАВІНА ТЫДНЯ.** Беларусы змогуць прыняць удзел у летніх Паралімпійскіх гульнях 2024 года ў Парыжы. Яны будуць выступаць у нейтральным індывідуальным статусе. Такое рашэнне прынята 29 верасня на Генеральнай асамблеі Міжнароднага паралімпійскага камітэта ў Манаме (Бахрэйн). Акрамя таго, цяпер беларускія спартсмены змогуць выступаць на ўсіх турнірах пад эгідай МПК. Разам з тым Паралімпійскі камітэт пакуль не аднаўлены ў якасці паўнапраўнага члена МПК. Пры гэтым члены Міжнароднага паралімпійскага камітэта на генасамблеі ў Манаме (Бахрэйн) прагаласавалі супраць поўнага прыпынення членства Паралімпійскага камітэта Беларусі.

**АБ'ЯВА ТЫДНЯ.** Чатыры беларускія плыўцы атрымалі нейтральны статус для ўдзелу ў спаборніцтвах Міжнароднай федэрацыі плавання (World Aquatics). Нейтральны статус і разам з ім допуск да турніраў атрымалі наймацнейшыя беларускія спартсмены: рэкардсмен свету на стометроўцы брасам на кароткай вадзе Ілья Шымановіч, а таксама лідары жаночай каманды — Анастасія Шкурдай, Аліна Змушко і Анастасія Куляшова. Да міжнародных стартаў допушчаны і трэнер Андрэй Ліпніцкі. У верасні World Aquatics аб'явіла аб вяртанні беларускіх і расійскіх спартсменаў на спаборніцтвы пад эгідай арганізацыі пры выкананні шэрагу ўмоў, уключаючы ўдзел пад нейтральным сцягам і толькі на індывідуальных дыстанцыях, а таксама забарону на зносіны са СМІ падчас турніраў.



**МЕДАЛІ ТЫДНЯ.** У Анапе завяршыўся міжнародны турнір па боксе памяці Мікалая Паўлюкова сярод спартсменаў, не старэйшых за 22 гады. Беларусь на гэтым турніры прадстаўлялі восем спартсменаў, шэсць з якіх сталі медалістамі. Сярэбраным прызёрам у вагавой катэгорыі да 57 кг у хлопцаў стаў Максім Панькоў, бронзавыя ўзнагароды заваявалі Дзмітрый Балькоў (да 60 кг) і Мікіта Нагорны (да 92 кг). Сярод дзяўчат трэція месцы занялі Ірына Вінаградава (да 50 кг), Марына Мулярчык (да 57 кг) і Дар'я Ляцко (да 66 кг). На спаборніцтвах выступілі больш за 160 маладых баксёраў з 17 краін.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** Беларусы заваявалі шэсць медалёў на міжнародных спаборніцтвах па фехтаванні ў Арменіі. У першы дзень спаборніцтваў сярод юніёраў 2003—2006 гадоў нараджэння былі разыграны ўзнагароды сярод рапірыстаў і шпажыстаў у індывідуальным відзе праграмы. Беларускія юніёры ў двух відах зброі заваявалі 1 залаты, 2 сярэбраныя і 3 бронзавыя медалі. У рапіры сярод юніёраў роўных не было Уладзіславу Мікалаюку, а бронза дасталася Уладзіміру Бутэнку. У спаборніцтвах шпажыстаў сярэбраную ўзнагароду заваяваў Міхаіл Мітраховіч. Бронзавыя медалі турніру ўзялі Рыгор Мураўёў і Аляксей Рэкіш.

**ЦЫТАТА ТЫДНЯ.** «Мы будзем праводзіць спартыўныя фестывалі для дзяцей ва ўзросце ад 6 да 10 гадоў. У найбліжэйшы час правядзём некалькі паказальных фестываляў у рэгіёнах. Кожная ДЮСШ, прыватная школа ці іншае якое-небудзь фарміраванне збірае дзяцей і па ўстаноўленай праграме праводзіць такі фестываль разам з бацькамі. Гэта значыць, ва ўзросце да 10 гадоў дзеці ўжо будуць займацца футболам, і мы будзем бачыць, хто лепшы, хто горшы. Будзем прыглядацца як індывідуальна, так і ў рабоце ў камандзе», — заявіў **старшыня асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» Мікалай ШАРСНЁЎ** падчас адкрыцця абноўленай футбольнай пляцоўкі СДЮШАР ФК «Віцебск». Ён падкрэсліў, што таму рашэнню папярэднічала вялікая аналітычная работа. «Калі мы дэталёва прааналізавалі, чаму не гуляюць клубы ці ўзровень гульні нашых клубаў у Вышэйшай лізе невысокі і ў той жа час чаму нацыянальная зборная няўдала гуляе, мы знайшлі наступныя прарэхі. Першае — у нас няма спаборніцкай практыкі ў дзіцяча-юнацкім футболе, адсутнічаюць чэмпіянаты розных узроўняў. Атрымліваецца, дзеці, якія займаюцца ў дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе, не маюць спаборніцкай практыкі. Таму мы вярнуліся да той структуры правядзення чэмпіянатаў. Чэмпіянаты рэспубліканскія будуць праходзіць для дзяцей ва ўзросце 11, 12, 13 і 14 гадоў», — прыводзіць словы Мікалая Шарснёва БелТА.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

# СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.14 | 18.42 | 11.28 |
| Віцебск — | 7.05 | 18.31 | 11.26 |
| Магілёў — | 7.04 | 18.32 | 11.28 |
| Гомель — | 7.00 | 18.30 | 11.30 |
| Гродна — | 7.30 | 18.57 | 11.27 |
| Брэст — | 7.29 | 18.59 | 11.30 |

### Месяц

*Поўня 29 верасня.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

### Імяніны

*Пр. Алега, Аляксандра, Міхаіла, Фёдара.*
*К. Тэрэзы, Юзафа, Яна.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 3 КАСТРЫЧНІКА

У краіне

**1938** год — нарадзіўся Алег Георгіевіч Пратапопаў, беларускі вучоны ў галіне тэхнічнай кібернетыкі і інфармацыйных тэхналогій, кандыдат тэхнічных навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1985).

**У гэты ж год** нарадзіўся Ігар Пятровіч Крук, беларускі тэхнолаг сродкаў вылічальнай тэхнікі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1981).



**1948** год — нарадзіўся Анатоль Абрамавіч Гантварг, беларускі спартсмен (шашкі-100), міжнародны гросмайстар, заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Беларусі. Чэмпіён свету (1978, 1980, 1984, 1985). Чэмпіён Еўропы ў камандным першынстве (1971, 1980). Чэмпіён СССР (1969, 1973, 1977) у асабістым першынстве, пераможца Сусветнай шашачнай алімпіяды (1992) у складзе каманды Беларусі.

**1953** год — нарадзіўся Юрый Васільевіч Рудэнка, беларускі мастак. Аўтар прызоў для «Шагалаўскага пленэру», фестывалю «Славянскі базар у Віцебску», батыкаў «Першыя кветкі», «Бэз», «Белая ноч» і інш.

У свеце

**1803** год — нарадзіўся Джон Горы, амерыканскі ўрач, які адкрыў асноўны прынцып халадзільных установак, калі сціснутыя кампрэсарам газ або вадкасць астуджаюцца пры пашырэнні падчас праходжання праз змеявік.

**1873** год — нарадзіўся Вячаслаў Якаўлевіч Шышкоў, рускі пісьменнік. Аўтар раманаў «Ватага», «Угрум-рака», гістарычнай эпапеі «Емяльян Пугачоў», аповесцяў, апавяданняў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946). На беларускую мову яго асобныя апавяданні пераклаў Кандрат Крапіва.

**1918** год — нарадзіўся Бэн Мікалаевіч Бенцыянаў, расійскі артыст эстрады, тэатра, народны артыст РСФСР.



**1953** год — нарадзілася Тэрэза Ганібалаўна Дурава, расійская артыстка цырка і тэатра, рэжысёр, арганізатар і мастацкі кіраўнік маскоўскага тэатра клаўнады «Тэатрыум на Серпухоўцы», народная артыстка Расійскай Федэрацыі.

**У гэты ж год** нарадзілася Алена Аляксееўна Коранева, расійская актрыса тэатра і кіно. Здымалася ў фільмах «Раманс аб закаханых», «Ася», «Той самы Мюнхгаўзен», «Пакроўскія вароты» і інш.

Так гаварыла...

**САФІ ЛАРЭН:**

*«Нішто не робіць жанчыну больш прыгожай, чым упэўненасць у тым, што яна прыгожая».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Калі мне казалі: «Вучыся, працуй, вечарынкі нікуды не падзенуцца!» — гэта была хлусня. Вечарынкі якраз кудысьці падзеліся, а вось праца і вучоба — не.**

— Памятаеш, я сёння раніцай бегала па кватэры з радасным крыкам «Ура! Я нарэшце знайшла ключы!»?

— Ну так.

— Ты не бачыў, куды я іх пасля гэтага паклала?

**Заўсёды хваліце свайго мужа. Вось я свайму пастаянна кажу: «Любімы, табе дасталася найлепшая жанчына ў свеце!» У яго ад такой радасці аж вока крывіцца.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.298. Індэкс 63850. Зак. № 2442.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 2 кастрычніка 2023 года.